УДК 398.332.47(=161.3)

А. С. Цыганкова

Навук. кір. – У. Я. Аўсейчык, канд. гіст. навук, дацэнт

# ТРАДЫЦЫЙНАЯ МАСЛЕНІЧНАЯ АБРАДНАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ І ФОРМЫ ЯЕ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ

У артыкуле разгледжана традыцыйная масленічная абраднасць беларусаў, выяўлены асаблівасці яе функцыянавання на сучасным этапе праз рэпрэзентацыю установамі культуры. Мэта даследавання – выявіць адпаведнасць сцэнару тэатралізаваных пастаноў кананічнаму традыцыйнаму абраду на тэрыторыі Беларускага Падзвіння. Для дасягнення пастаўленай мэты быў выкарыстаны значны аб�by"ём фальклорных і этнаграфічных крыніц.

На сучасным этапе ў выніку працэсаў урбанізацыі і ўніфікацыі культуры народныя святы не ўспрымаюцца ў якасці сімбіёза чалавека і прыроды, а пераўтвараюцца ў тэатральны спектакль. Даследванне каляндарнай абраднасці беларусаў знайшло адлюстраванне ў вялікім аб‟ёме публікацый, але ў большасці з іх амаль не звяртаецца ўвага на сучасны стан традыцыі і перспектывы яе захавання. Таму навізна даследвання заключаецца ў адказе на пытанне: «Ці магчыма на сто адсоткаў аднавіць і захаваць традыцыйны абрад?» Веснавы цыкл абрадаў у земляробчым календары пачынаўся яшчэ да наступлення вясны, калі прыходзіла пара рыхтавацца да палявых работ. Абрады, тэксты песень, рытуальныя дзеянні, якія праводзіліся ў памежкавы перыяд былі скіраваны на праводзіны зімы (холаду, цемры, неспакою) і сустрэчу вясны (святла, цеплыні, абуджэння прыроды). 317 У еўрапейскіх народаў у адпаведнасці з хрысціянскім календаром праводзіны зімы сталі спраўляцца перад пастом – у перыяд масленічнага тыдня. Як адзначае В. К. Сакалова, калі ў рускіх свята праводзілася з неверагодным размахам, то ў украінцаў і беларусаў Масленіца не атрымала асаблівага развіцця [1, с. 11]. Даследчык П. А. Бяссонаў нават сцвярджаў, што ў беларусаў на масленіцу звычаяў і абрадаў захавалася менш, чым ва ўкраінцаў [2, с. 135]. Але нягледзячы на тое, што рускі масленічны комплекс з‟яўляецца найбольш развітым, у кожнага народа ў ходзе гістарычнага развіцця выпрацаваліся свае адметныя рысы. Разглядаючы бытаванне абраду на тэрыторыі Беларусі, даследчыкі прыходзяць да высноў, што арэал распаўсюджання свята ахоплівае ўсходнюю Беларусь, а таксама цэнтральную частку краіны. У сваю чаргу, на тэрыторыі Падзвіння арэал бытавання абраду абмежаваны, найбольш поўна ѐн прадстаўлены ва ўсходняй частцы Падзвіння [3, с. 220]. Масленіца – архаічнае свята, звязанае з абуджэннем прыроды і культам Сонца, святкаванне вагаецца ад 3 лютага (21 студзеня) да 14 сакавіка (1 сакавіка). Масленічны перыяд – прамежкавы час паміж зімой і вясной, што прыводзіць да спалучэння зімовых і веснавых абрадаў. Святочны комплекс вылучае некалькі элементаў, з якіх складаюцца мікралакальныя версіі свята. Напярэдадні Масленіцы ў суботу зафіксавана традыцыя спраўляць «Дзяды», яны маюць назву «Мясніцы», «Масленічныя», «Мясаедныя» Дзяды: «Чэцвера Дзядоў гадавых. Траецкія былі, Асеннія, наверна, і ў Масленіцу былі» (Сенненскі р-н) [4, с. 65]. Гэтая памінальная традыцыя распаўсюджана на Падзвінні (менавіта ва ўсходняй і цэнтральнай частках рэгіена, а таксама на Докшыччыне), Падняпроўі і Усходнім Палессі [5, с. 327]. Спецыфічнай рысай рэгіена з‟яўляецца прыгатаванне для памінальнай трапезы бліноў: «Адзначалі Масляныя Дзяды – гатавалі ўсе масляное» (Чашніцкі раѐн Віцебскай вобласці) [5, с. 328]. Святкаванне Масленіцы на Падзвінні мае шэраг асаблівасцей: 1) Моладзі шлюбнага ўзросту, якія не паспелі пабрацца шлюбам да Масленіцы, на знак сімвалічнага пакарання (каб не засядзеліся ў бабылях ці старых дзеўках) вешалі маленькія драўляныя калодкі. Тыя, мусілі адкупіцца пачастункам [6, с. 129]. У стварэнні сямей была зацікаўлена вясковая грамада, бо гэта станоўча ўплывала на жыццяздольнасць вясковага соцыума. 2) Любімым заняткам моладзі на працягу масленічнага тыдня было катанне з горак, якое адлюстравана ў масленічных песнях: «Мы на горку выхадзілі,/ Выхадзілі люлі, люлі./ Гору сырам ныбівалі, / Ныбівалі, люлі, люлі./ Маслам гору пылівалі,/ Пылівалі, люлі, люлі./ Нашы сані Фольклористика и этнография 318 з тырмызамі,/ З тырмызамі,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

люлі, люлі./ Сані з горкі пубіжалі, / Пубіжалі, люлі, люлі./ Нам ахота прыкаціцца,/ Прыкаціцца, люлі, люлі» (Віцебскі раѐн Віцебскай вобласці) [7, с. 75]. Катанне з гор мела не толькі функцыю забавы, але і прадвяшчала магічнае ўздзеянне на плоднасць зямлі: «На санках «женки» должны проехать с горы на прялице: чем длиннее будет такой проезд, тем длиннейший будет лен» [8, с. 238]. 3) Гушканне на арэлях мела магічны характар аграрнай скіраванасці. Лічылася, што чым вышэй уздымаюцца арэлі, тым вышэй вырасце лѐн. Гэта дзея суправаджалася спевамі песень: «На вуліцы масленіца, мсленіца, у-у-у-у ,/ Вылецела з куста ластавіца, ластавіца,/ Села яна на тыну, на тыну,/ Акідала масла па каму, па каму […]» [9]. Для песень, якія маюць загукальную скіраванасць, характэрныя імітацыі галасоў птушак. 4) Адметнай рысай паўночна-ўсходняй тэрыторыі Падзвіння з�005уляюцца архаічныя масленічныя гульні, прымеркаваныя да сустрэчы і провадаў Масленіцы. Пахаванне «дзеда» («Дзед касцей падавіўся») і «бабы» («Баба сырніцай падавілася») зафіксавана ў Гарадоцкім, Шумілінскім, Лезненскім, усходняй частцы Полацкага раѐнаў [10, с. 158]. Аналіз структуры і зместу абраду дазваляе сцвярджаць пра існаванне лакальнай варыятыўнасці згаданых абрадаў. Напрыклад, у якасці «дзеда» і «бабы» у розных весках маглі выкарыстоўваць то жывога чалавека (Шумілінскі раѐн), то ляльку (Гарадоцкі, Лезненскі, усходняя частка Полацкага раѐнаў), якую (в. Маскаляняты Гарадоцкага раѐна) закапвалі ў снег [7, с. 689]. На думку некаторых даследчыкаў, расправа над «дзедам», «бабай» мела язычніцкае паходжанне і сімвалізавала перамогу лета над зімой. Іншыя навукоўцы лічаць, што смерць з‟яўляецца неабходнай умовай для адраджэнне прыроды вясной [10, с. 161]. Метад творчай рэалізацыі фальклора ў працэсе ўвасаблення ў мастацтве сучасная навука вызначае як фальклярызм [11, с. 171]. Фальклярызм у канцэртна-сцэнічнай практыцы – гэта шматстайная і складаная з'ява, якая характарызуецца рознымі падыходамі да рэпрэзентацыі: метады ўвасаблення фальклору вагаюцца ад трансляцыі традыцыі, калі асноўнай мэтай з‟яўляецца імкненне перадаць аўтэнтычную манеру выканання, да аўтарскай імправізацыі. Гэта з‟ява назіраецца ў рэпрэзентацыі каляднай абраднасці ва ўстановах культуры Віцебшчыны. Першае, на што трэба акцэнтаваць увагу: для чалавека традыцыйнай культуры каляндарнае свята, у тым ліку Масленіца, – свята, у якім не было падзелу на «выканальнікаў» і «гледачоў», асноўныя камунікацыі праз рытуалы адбываюцца паміж чалавекам і прыродай. У гэтым 319 адрозненне ад рэпрэзентацыі ў гарадскіх і вясковых клубах, калі асноўнае ўзаемадзеянне адбываецца паміж «вядучымі» і «гледачамі», а еднасць чалавека і прыроды ў масленічнай абраднасці – страчваецца. Каляндарнае свята – момант, калі адбываецца ўзаемадзеянне паміж рэальным і сакральным светам. На сучасным этапе назіраецца тэндэнцыя да размывання паняцця сакральнага, страчваецца магічная прагматыка свята, на першы план выступае забаўляльная функцыя. Напрыклад, гушканне на арэлях у перыяд масленічнага тыдня – гэта таксама і магічны спосаб спрыяць плоднасці зямлі, зараз жа гэта выключна забава для дзяцей і моладзі. Адыход ад традыцыйнага ладу жыцця прыводзіць да змены атрыбутыўнага коду свята. На сучасным этапе прастора святкавання пераносіцца з прыроднай у сацыяльную сферу (гарадскі парк, пляцоўка ва ўстановах культуры). Сімвалам Масленіцы лічыцца бліны, але як адзначае В. К. Сакалова, знакам масленіцы бліны сталі толькі ў рускіх, для ўкраінцаў і беларусаў яны не характарныя [1, с. 47-48]. Распаўсюджанне выкарыстання бліноў не толькі на тэрыторыі Беларускага Падзвіння, але і паўсюдна па Беларусі, верагодна з‟яўляецца вынікам рускага ўплыву на памежныя тэрыторыі. Фалькларыст XIX ст. П. А. Бяссонаў адзначае, што галоўнай беларускай масленічнай стравай былі не бліны, а варэнікі з сырам: «Кое-где, ближе к нам [рускім], [распаўсюджаны] блины и аладьи, но общее вареник с начинкой и особенно сыром: сыр […], овечий и козий» [2, с. 135]. Зараз жа бліны – гэта адзін з самых вядомых і распаўсюджаных сімвалаў Масленіцы, але, як паказвае даследванне, падставай для гэтага ў асноўным быў уплыў іншай традыцыі. Яшчэ адным сучасным сімвалам Масленіцы, з‟яўляецца спальванне пудзілы, якое штучна атрымала распаўсюджанне на тэрыторыі Беларускага Падзвіння. У сучасных сцэнарыях спальванне «масленкі» характарызуецца, як ахвяра цеплыні і сонейку, часта сустракаецца вераванне ў тое, што на вогнішчы спальваюцца нязгоды, крыўды і беды. Але даследчыкі адзначаюць, што у беларусаў абраду спальванне пудзілы і распальвання на масленіцу

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

вогнішчаў не было [1, с. 35]. Гэты тэзіс падцвярджае як аналіз апублікаваных матэрыялаў [7], так і архіўных. Найбольш «жывучым» дзеяннем на Масленіцу з�much‶яўляецца катанне на конях, якое раней праходзіла з чацвярга і да запустаў [7, с. 71]. Даследчыкі не прыйшлі да агульнай высновы, ці мела катанне на конях рытуальнае значэння, альбо было толькі святочнай забаўкай. Верагодна, што катанне на конях з‶явілася значна пазней чым катанне з гор, спачатку ў гарадах і вялікіх гандлѐвых сѐлах, асабліва сярод купецтва, які Фольклористика и этнография 320 жадаў пахваліцца сваім багаццем [1, с. 45]. Зараз гэта адно з улюбленных дзеянняў моладзі, якое адбываецца падчас святкавання Масленіцы ў вясковых і гарадскіх Дамах Культуры. Спрабуючы адказаць на пытанне: «Ці магчыма аднавіць кананічны абрад», трэба ўлічваць шмат фактараў, па-першае, значны ўдар па традыцыйнай культуры адбыўся ў савецкія часы, калі некаторыя савецкія навукоўцы спрабавалі звесці абрады і рытуалы да народных забаў, маўляў, што вяскоўцы спрабавалі разнастаіць свае цяжкае жыцце. Падругое, прасочваецца недахоп лакальнага матэрыялу, што і прыводзе да ўніфікацыі культуры. Прымаючы пад ўвагу гэтыя фактары я лічу, што немагчыма на 100 % аднавіць традыцыйны абрад, але, дзякуючы ўдасканаленню метадаў навуковага вывучэння народнай культуры, важнейшым застаецца метад палявых даследаванняў, магчыма наблізіцца да аўтэнтычнага выканання. Такім чынам, беларускія народныя святы яшчэ ў XIX – першай палове XX ст. былі набліжаныя да «прыродных рытуалаў», якія ўводзілі быццё чалавека на касмічны ўзровень. Але ўжо з сярэдзіны XX ст. актыўна распачаўся працэс знікнення сімволікі і вобразнасці традыцыйных святкаванняў, назіраецца тэндэнцыя да ўніфікацыі культуры без уліку лакальных асаблівасцей. Каляндарныя святы страчваюць магічнааграрную прагматыку і набываюць значэнне «свецкай гулянкі».

Спіс літаратуры

1 Соколова, В. К. Весенне-летние календарные обряды русских, украинцев и белорусов XIX – начало XX в. / В. К. Соколова. – Москва : «Наука», 1979. – 287 с.
2 Бессонов, П. А. Белорусские песни, с подробными объяснениями их творчества и языка, с очерками народного обряда, обычая и всего быта: сборник песен / П. А. Бессонов. – Москва: тип. Бахметева, 1871. – 176 с.
3 Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. Т. 6: Гомельскае Палессе і Падняпроўе: у 2 кн. Кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.]; ідэя і агульнае рэдагаванне Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2013. – 1231 с.
4 Полацкі этнаграфічны зборнік / уклад.,прадм. і паказ. У. А. Лобача. – Вып. 2: Народная проза беларусаў Падзвіння: у 2 ч. Ч. 2. – Навапалацк : ПДУ, 2011. – 368 с.
5 Аўсейчык, У. Я. Традыцыі памінання продкаў у структуры масленічнай і вербнай памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння (па матэрыялах XIX – пачатку XXI ст.) / У. Я. Аўсейчык // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтва : мат. Міжнароднай навук.-практ. канф. (20–21 лістапада 2014 г., 321 г. Мінск) / уклад. Ю. В. Пацюпа; гал. рэд. А. І. Лакотка; Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. – Мінск : Права і эканоміка, 2014. – С. 327-330.
6 Лобач, У. А. Этнаграфія Беларусі: вучэб.-метод. комплекс / У. А. Лобач. – Навапалацк : ПГУ, 2006. – 195 с.
7 Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. Т. 2: Віцебскае Падзвінне / Т. Б. Варфаламеева, А. М. Боганева, М. А. Козенка і інш.; складальнік Т. Б. Варфаламеева. – Мінск : Бел. навука, 2004. – 910 с.
8 Никифоровский, Н. Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи Витебской Белоруссии / Н. Я. Никифоровский. – Витебск: Губерн. тип-литограф., 1897. – 338 с.
9 Мажэйка, З. Я. Голоса веков [Электронный ресурс] // З. Я. Мажэйка, А. І. Шкляроўскі. – Режым доступу: https://ethnoby/videateka/526395026. –Дата доступу: 05.05.2020.
10 Кухаронак, Т. І. «Дзед касцей падавіўся»: рэгіянальна-лакальная спецыфіка масленічнай гульні беларусаў Падзвіння / Т. І. Кухаронак // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зборнік навуковых прац міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 160-годдзю з дня нараджэння А. П. Сапунова (Полацк, 21-23 красавіка 2011 г.) : у 2 ч. / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт ; [пад агульн. рэд. Д. У. Дука, У. А. Лобача]. – Навапалацк : ПДУ, 2011. – Ч.2. – С. 158-161.
11 Гурченко, А. К вопросу сценического воплощения фольклора в деятельности современных исполнительских коллективов Беларуси / А. И. Гурченко // Этнография Алтая и сопредельных территорий: материалы 9- й международной научной конференции, посвященной 25-летию центра устной истории и этнографии лаборатории исторического краеведения Алтайского государственного

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

педагогического университета (Барнаул, 28–30 октября 2015 г.). Вып. 9 / под ред. Т. К. Щегловой. – Барнаул: АлтГПУ, 2015. – 388 с. : ил.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ